# ЛЮДЗІ АСОБАГА СКЛАДУ

Цяжка пераацаніць значэнне і каштоўнасць новай дакументальнай кнігі аб беларускіх партызанах — запісак Героя Совецкага Саюза В. І. Казлова — «Людзі асобага складу» ў літаратурным запісу А. Кулакоўскага.

Яна прыцягвае ўвагу чытача, перш за ўсё, сваёй мэтанакіраванасцю. Аўтар паставіў задачу, як цэнтральную ў кнізе — паказаць кіруючую ролю большэвіцкай партыі ва ўсенароднай партызанскай вайне. З гэтай задачай ён поўнасцю справіўся. У цэнтры ўвагі знаходзіцца дзейнасць Мінскага падпольнага абкома партыі,




якая ілюструецца багатым фактычным матэрыялам.

З першых-жа дзён вайны па ўказанню таварыша Сталіна беларускія большэвікі робяць усё неабходнае для дапамогі фронту. Надоўга ў памяці застаецца нарада 22 чэрвеня 1941 года ў кабінеце сакратара ЦК КП(б)Б Панцелеймона Кандрацьевіча Панамарэнкі. Тут мы ўпершыню чуем простыя і ясныя ўказанні таварыша Сталіна па прамому проваду: усё для вайны, усё для фронта. На нарадзе быў прыняты спецыяльны план дапамогі вайсковым часцям і злучэнням, якія вялі бai з вераломным ворагам на граніцы. Адказныя кіраўнікі партыі і беларускага ўрада тэрмінова выязджаюць у пагранічныя раёны са спецыяльнымі даручэннямі. Такім чынам, з першых-жа старонак кнігі перад чытачом рысуюцца эпізоды вялікай і складанай работы большэвіцкай партыі па арганізацыі і кіраўніцтву барацьбой совецкага народа з гітлераўскім фашызмам у Вялікай Айчыннай вайне. І чым далей мы чытаем кнігу, тым больш і больш упэўніваемся ў тым, што аўтар узяў для сваёй кнігі найбольш яркі, найбольш характэрны матэрыял са шматлікіх матэрыялаў аб гераічнай барацьбе совецкага народа з фашысцкімі акупантамі.

Ярка пададзены эпізоды баёў за сталіцу Совецкай Беларусі — Мінск. Захапляюць сваёй мужнасцю і самаахвярнасцю подзвігі рабочых, якія пад няспыннай бамбёжкай дэмантыравалі і выратоўвалі абсталяванне сталічных прадпрыемстваў, каб эвакуіраваць яго ў глыбокі совецкі тыл. Усюды ствараюцца дружыны самаабароны, якія ўзначальваюцца комуністамі, ідзе дзейсная падрыхтоўка да стварэння большэвіцкага падполля. Тут мы знаёмімся з асноўнымі героямі кнігі, жывымі ўдзельнікамі партызанскай барацьбы — Іосіфам Аляксандравічам Бельскім, Іванам Дзяні́савічам Варвашэнем, Аляксеем Георгіевічам Бондарам, Раманам Наумавічам Мачульскім і другімі. Яны разам з аўтарам кнігі В. І. Казловым узначалілі потым Мінскі падпольны абком, кіравалі дзейнасцю партызанскіх атрадаў і злучэнняў не толькі Мінскай, але і другіх абласцей рэспублікі.

Да найбольш яркіх старонак кнігі, якія вызначаюцца не толькі сваёй выключнай праўдзівасцю, але і мастацкім майстэрствам, трэба аднесці тыя старонкі, у якіх апісваецца бой за мястэчка Беразіно 3 ліпеня 1941 года, калі проста на перадавой байцы слухалі выступленне таварыша Сталіна па радыё, у якім была дадзена праграма барацьбы совецкага народа з ворагам. У сэрцы совецкіх патрыётаў глыбока запалі словы любімага правадыра аб тым, што на акупіраванай тэрыторыі неабходна ствараць невыносныя ўмовы для ворага, што неабходна ствараць конныя і пешыя партызанскія атрады, псаваць сувязь, нападаць на варожыя абозы, штабы і гарнізоны. Гэтыя ўказанні таварыша Сталіна, як мы бачым далей з запісак В. І. Казлова, няўхільна ажыццяўляліся беларускімі партызанамі, ператвараліся ў канкрэтныя баявыя справы.



З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы